Віктар ЖЫБУЛЬ

# ФОРМАВІДЗЕЦ, ВОБРАЗАПІСЕЦ, МУЗЫКАСЛОВЕЦ

## ПАЭЗІЯ ЯЗЭПА ПУШЧЫ Ў КРЫТЫЧНЫМ АСЭНСАВАННІ АДАМА БАБАРЭКІ

*Заканчэнне. Пачатак у № 5.*

Лірычнага героя Язэпа Пушчы Адам Бабарэка неаднойчы называе "Сымонам Музыкам у горадзе". Выведзены Якубам Коласам герой не проста ўвасабленне самабытнага таленту з народа, а, паводле А. Бабарэкі, асаблівы псіхалагічны тып чалавека, якому ўласцівыя *"тонкая пачуцьцёвая організацыя, павыш*[аная] *здольнасьць чуцьця, усераз*[ь]*мерная чуласьць", "творчае выбражэньне", "нявінна-дзіцяч*[ая] *наіўнасьць", "практ*[ычная] *нецьвярозасьць"* і разам з тым – *"сконцэнтр*[аванасьць] *творч*[ая]*"*. Такі чалавек *"шчыры, просты, не прыкід*[ваецца]*"*, ён *"жыве бяг*[учым] *момантам"*, мае патрэбнасць выказацца, *"творыць у час узьнёсласьці"*, шукае *"свабоду духу"*. Яго творчасць – вобразная і канкрэтная; *«гэта прыродн*[ая], *праўд*[зівая] *музыка, адклік*[аючаяся] *рэхам на "родную зьяву", і, відаць таму ён – "сынтэтык" і "толькі праява і голас мікракосму"»* [3, с. 635]. Толькі Я. Колас распавёў пра такога чалавека як пра трэцюю асобу: яго Сымон Музыка *"гаворыць такім-жа стыл*[ем], *як гавор*[ыць] *і аўтар пра яго, гаворыць колас*[аўскаю] *моваю"*. А творы Я. Пушчы, на думку А. Бабарэкі, з'яўляюцца прыкладам таго, як расказаў бы сам пра сябе Сымон Музыка, калі б прыйшоў не ў музыку, але ў літаратуру, – яго мова была б адрознай ад коласаўскай, з яго вуснаў думкі і перажыванні гучалі б па-іншаму. Гэтую адрознасць А. Бабарэка паказаў на прыкладзе супастаўлення радкоў з паэмы "Сымон Музыка" Я. Коласа і верша "Ой ды песні мае цёмнавірыя!" Я. Пушчы. Калі першы пра свайго героя пісаў: "У яго быў сьвет цікавы, / Свае вобразы, жыцьцё, / І ў душы ў яго ўсе зьявы / Сваё мелі адбіцьцё", то другі прызнаваўся: *"Хоць я вырас, як сын той сабачы, / Ўсё-ж жыве у грудзёх сакалінае слова"* [3, с. 634]. Як бачым, лірычны герой Я. Пушчы для самахарактарыстыкі выкарыстоўвае інакшыя інтанацыі, вобразныя і лексічныя сродкі.

Па-іншаму, чым Я. Колас, Я. Пушча выяўляе прыгажосць роднага краю. Калі Я. Колас пачаў *"паказв*[аць] *гэта хараство ў об'ект*[ыўнай] *эпічн*[ай] *тон*[альнасьці], *але ўсё-ж ён больш аб ім гаварыў, чымся паказваў"*, то Я. Пушча выводзіў *"малюнкі… у колерах свайго* ***адчуваньня*** *яго (ці пазнаньня, як ён кажа), ахварбаваўшым яго сваімі эмоцыямі (у эмоц*[ыйнае] *сакалін*[ае] *слова), расьпісваючы яго словам-вобразам у песьні"* [3, с. 746 – 747].

Вядома ж, творчы светапогляд абумоўліваецца сацыяльнымі абставінамі і жыццёвым вопытам: Я. Пушча быў песняром маладой інтэлігенцыі, што на хвалі рэвалюцыйных пераўтварэнняў прыйшла з вёскі ў горад. Таму і Беларусь у яго вершах паўстае не "няшчаснай, забітай і забытай", як у творах ранейшых пісьменнікаў, а "маладой, бунтарскай, свавольнай", якая ідзе ў горад "буяніць" і кажа: "Мы волю сваю абаронім". Тэматычна і вобразна многія яго вершы былі звязаныя з вёскай, з прыродай яе ваколіц, але спосаб выказвання Я. Пушча абраў для тагачаснай беларускай паэзіі не зусім звычайны: ён свядома абвясціў сябе беларускім імажыністам і напачатку імкнуўся трымацца канонаў гэтага літаратурнага кірунку, звяртаючыся да ўскладненай вобразатворчасці. Як зазначыла сучасная даследчыца паэзіі 1920-х Ірына Багдановіч, "абнаўленне старой вёскі ў імажыніцкім светабачанні Пушчы было канкрэтным і канцэптуальна звязаным з разуменнем ім тагачаснага авангардызму" [4, с. 336].

Гэты момант, аднак, у працах А. Бабарэкі зарэтушаваны: яны пісаліся ўжо тады, калі прыхільнасць да імажынізму (нават былая) успрымалася ў савецкім літаратурным грамадстве негатыўна і магла наклікаць на паэта небяспечныя палітычныя абвінавачанні. А Я. Пушча і так на той момант быў ахвярай несправядлівых крытычных нападак з боку Ц. Гартнага (З. Жылуновіча), Т. Глыбоцкага (А. Дудара), А. Сянкевіча і іншых, ад каго імкнуўся абараніць яго А. Бабарэка. Таму крытык зрабіў акцэнт на вершы "Эх, песня!.." (1925), дзе Я. Пушча і сам намякаў на тое, што імажыніцкі перыяд з'яўляецца для яго хоць і неабходным, але часовым, што ён у любы момант гатовы змяніць сваю паэтычную "вопратку": *"Ой да скіну не сёння дык заўтра / Я шаўро і ангельскую світку. // Ды зноў апрануся папросту: / У зрэб'е, шарачак стракаты"* [5, с. 55]. (Дарэчы, *"ангельская світка"* ў вершы адсылае і да англамоўнай паэтычнай школы імажызму, пра якую, як вынікае, таксама меў уяўленне Я. Пушча.) Спасылаючыся на гэты верш, А. Бабарэка зазначыў адрозненне паэзіі Я. Пушчы ад "сапраўд-

*Звесткі пра аўтара змешчаны ў № 4.*

**Табліца.** Падабенствы і адрозненні паэтыкі Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Пушчы паводле А. Бабарэкі.

| | Рытміка | Трактоўка | Сугучнасць | Аздоба | Канструкцыя |
|---|---|---|---|---|---|
| Янка Купала | класічна-размераная | рамантычная або рэалістычная | унутраная | звычайная | трыбунная |
| Якуб Колас | аднагучная, працяглая | пачуццёвая і вонкавая (дзейная), вырашальная | узглядная, мяккая, роўная, ціхая, спакойная | рознакаляровая, найбольш эмацыйна-ацэначная | апавядальная, казачная |
| Язэп Пушча | не класічная, вольна-дольная | пабытовая, сімвалічная, унутраная | яркая, мяккая | бліскучая, каларытная, жывапісная | "сам сабе", мастацкая, вобразная |

ных" імажыністаў: тое, што для апошніх было самамэтай (вобразатворчасць), для беларускага паэта з'яўлялася *«толькі сродкам, толькі фармальным спосабам змаганьня за "песьню-мужычку", за песьню, у якой ня крывяць душою, у якой усё, як у крышталі, за душой сагрэты сьпеў, за сьпеў, у якім бы крышталілася жыцьцё такім, якім яно ёсьць з яго законам і суровасьцю, яго рогатам і плачам і яго красою, яго прыгожасьцю, яго музыкай»* [3, с. 563]. Апранацца ж у *"шаўро і ангельскую світку"*, на думку А. Бабарэкі, было неабходна для таго, каб на пэўным этапе Я. Пушчу заўважылі і прынялі ў літаратурным асяродку, бо сустракаюць, як вядома, "па вопратцы", у дадзеным выпадку – па тым, у якой ступені аўтар валодае вобразна-стылістычнымі сродкамі. Зрэшты, нават пасля таго, як Я. Пушча намякнуў на свой адыход ад імажынізму, яго паэзія не страціла мастацкіх якасцей і наватарскага характару.

Адрознасць паэтыкі Я. Пушчы ад іншых аўтараў (як папярэднікаў, так і сучаснікаў), а разам з тым і яго месца ў літаратурным працэсе яшчэ больш яскрава бачыцца, калі А. Бабарэка звяртаецца да параўнальнага аналізу, у цэнтры якога – пэўны вобраз ці канцэпт, па-рознаму выяўлены ў творчасці розных паэтаў. Вось, напрыклад, як крытык прасочвае эвалюцыю вобраза сонца і яго сімвалічнага напаўнення ў беларускай паэзіі, завяршаючы агляд творчасцю Я. Пушчы: *«Сонца і зоры ў К*[упалы] *– гэта пун*[к]*т імкнен*[ьня]*, гэта ідэал. У Коласа гэта выражэньне душы сьвету. У Гаруна – хіба аб'ек*[т] *любві, тое, што грэе; высокае сонца аглядае працу, яно нізка бывае і ня грэе ("брат мой беларусін гібее бяз слонца") – гэта крыніца цяпла і асьвятленьня ("будзем зорак прыглядацца", "хоць промень сьвету прынясьлі мы ў пушчу гэту!")… <…> У Багдановіча гэта выяўленьне жывое красы сьвету, сваеасаблíва*[га] *жыцьця.*

*У Пушчы сонца губляе іскры, сонца песьціцца, сонца выган*[яе] *пасьвіць дзень – зусім не такое, як у папярэдн*[ікаў]. *Яно гаспадар. Яно суб'ект з рысамі, уласьці*[вы]*мі маладому селяніну, гаспадара сьвету. Яно асьвятл*[яе] *гэта маладое рэвалюц*[ыйнае] *сял*[янскае] *быцьцё (быт), яно выходзіць з нутра гэтага быту, з якога выходзіць і сам поэта»* [3, с. 707].

Адзначае А. Бабарэка наватарства паэта і ў фармальным плане, параўноўваючы рытмічна-інтанацыйныя асаблівасці твораў Я. Пушчы і яго літаратурных папярэднікаў. Падабенствы і адрозненні паэтыкі Я. Купалы, Я. Коласа і Я. Пушчы, акрэсленыя А. Бабарэкам, найзручней паказаць у выглядзе табліцы.

Менш увагі А. Бабарэка аддаў параўнанню творчасці Я. Пушчы і яго літаратурных аднагодкаў – прадстаўнікоў маладнякоўска-ўзвышэнскай генерацыі. Так, напрыклад, ён зазначыў, што *"ў Пушчы на першым пляне пачуцьцё. У Дуб*[оўкі]*… настрой, імкненьне, ідэя"* [3, с. 581]. Але творчасць У. Дубоўкі, як і Я. Пушчы, – прыклад высокай, выкшталцонай паэзіі, нездарма А. Бабарэка ставіў побач Дубоўкавы "Кругі" і Пушчавы "Лісты да сабакі". Вось з кім Я. Пушчу мала што яднае – дык гэта з тымі паэтамі, якія *"здаволі*[лі]*ся тым, што на іх долю выпала выконваньне абавязкаў вершапісца, што іх роля зьвялася да пісаньня вершаў на надзённыя політ*[ычныя] *тэмы, роля вершаваць патрэбнае: дырэктывы, лёзунгі, інфармацыю, справаздачы, даклады, агіт*[ацыйныя] *прамовы і г. д."* [3, с. 581]. Да такіх аўтараў А. Бабарэка адносіў, напрыклад, Андрэя Александровіча, Алеся Дудара і Сяргея Фаміна, хоць месцамі яго крытыка на іх адрас выглядае крыху аднабаковай.

Акрамя паэтычнай творчасці, Я. Пушча ў 1920-я гг. займаўся і крытычнай дзейнасцю. Ён апублікаваў артыкулы "Матывы маладняцкай паэзіі", "Аб жніўных песнях і абрадах", "Кніга лірыкі як мастацкае цэлае…", "За стыль эпохі", "У абарону маладой паэзіі", рэцэнзіі на кнігі К. Чорнага, А. Александровіча, А. Дудара, П. Глебкі, С. Дарожнага і інш. У запісах А. Бабарэкі знайшліся і новыя звесткі пра дзейнасць Пушчы-крытыка. Так, у бібліяграфічным нататніку расшыфраваны тры невядомыя раней псеўданімы і крыптанімы Я. Пушчы (Плашчынскага), не зафіксаваныя ў слоўніку Я. Саламевіча. Напрыклад, у газеце "Савецкая Беларусь" за 18 кастрычніка 1925 г. Я. Пушча выступіў з крытычнымі аглядамі часопіса "Маладняк" (№ 9) пад псеўданімам *П. Радзецкі* [1, арк. 29] і часопіса "Полымя" (№ 6) пад псеўданімам *Чытач* [1, арк. 67]. Рэцэнзію на паэму "Карчма" Міхася

Чарота [Маладняк, 1926, № 11 (2)] Я. Пушча чамусьці падпісаў крыптанімам *З. Ж.* [2, арк. 32] – ці не ў піку Змітру Жылуновічу (Цішку Гартнаму)? Акрамя таго, у бібліяграфічным нататніку А. Бабарэкі зафіксавана яшчэ адна крытычная публікацыя Я. Пушчы, падпісаная яго вядомым псеўданімам *Я. Кудзер*, але адсутная ў двухтомавым Зборы твораў 1993 – 1994 гг., – рэцэнзія на зборнік апавяданняў "Пела вясна" Міхася Зарэцкага (Савецкая Беларусь, 1925, 11 кастр.) [2, арк. 13]. Цікава, што яшчэ адзін псеўданім *Л. Трыер* [7, с. 119] і ў нататніках А. Бабарэкі, і ў дакументах "Узвышша" не расшыфраваны ніяк. Магчыма, подпіс *Л. Трыер* успрымаўся як калектыўны, свайго кшталту "Казьма Пруткоў беларускай крытыкі", і пазначаныя ім рэцэнзіі Я. Пушча пісаў пры ўдзеле С. Дарожнага ці М. Лужаніна.

Грунтоўнае і разнабаковае даследаванне Адамам Бабарэкам творчасці Язэпа Пушчы дапамагае нам убачыць яго паэзію як цэласную эстэтычную сістэму, заснаваную на багатай вобразатворчасці, музыкальнасці і здольнасці паказаць невядомае праз вядомае – і наадварот, звыклыя з'явы прадставіць як нешта дзіўнае, незвычайнае. Адна з заслуг Язэпа Пушчы, на думку крытыка, у тым, што ён ужо ў ранні перыяд творчасці "*даў адчуваньне слова як вобраза, як муз*[ычнага] *ак*[орда]" [3, с. 734]. Адрасаваныя найперш сучаснікам, працы Адама Бабарэкі, "чалавека бездакорнага густу" (У. Конан), не страчваюць значнасць і сёння. І каштоўныя яны не толькі аналізам творчасці ўласна Язэпа Пушчы, але і важнымі пытаннямі ўспрымання паэзіі ўвогуле.

*Спіс літаратуры пададзены да першай часткі артыкула ў № 5.*

Язэп ПУШЧА

* * *

*На расхрыстаны водшыб*
*з зарасляў вецер уцёк.*
*Рвецца ў пошыбе*
*сонца, –*
*шалясціць сухавеем трысцё…*
*О, сакаліныя песні, свавольце!*

* * *

*Хіляцца ніцам каліны.*
*Ветрась смяецца ў журбе.*
*Сеецца пухавы іней.*
*Дарога санямі храпе.*
*Мітульгой асыпае бярозы.*
*Кудзеляцца грывы у кляч.*
*О, вецер, мой, вецер цвярозы,*
*мяцеліцай поле ўскудлач!*
[1923 г.]

**ФАНТАЗІЯ НЕ Ў АЗІІ, А НА БЕЛАРУСІ**

*Сігналы,*
*гудкі*
*і электра-бляск*
*наўзвады мчацца ў цэмента-бетон.*
*Сталёва-аўтобусны лязг*
*нашых дзён камертон.*
*Самалёты*
*матораць паветра;*
*кожны быць хоча пілотам,*
*узняцца за хмары,*
*як птах:*
*Тра-та-та!*
*Тра-та-тах!*
*Мы канцавоссі зямлі перавернем, –*
*хоць учора*
*у горы*
*ніхто і не марыў.*
*Век трактара*
*ў полі ўжо тарарахкае*
*і коні не йдуць к вадапою, –*
*а радыю ніжа*
*ўсё ніжай*
*і ніжай*
*камуны праменні*
*у вогнева-крэмні.*
*І гэта ў лапцюжнай краіне,*
*дзе*
*белакудры ўсміхаецца дзень.*
*Эх, вецер, у намагнічаных крыллях,*
*я ў песні бронь сонца адзеў!*
[1925 г.]

**КАПЛІ ВАДЫ**

*Пякаюць каплі вады, –*
*Ў срэбрамёце іх смех.*
*На іх дзень маладых*
*Кулакі*
*Скамячыць не пасмеў.*

*Ён госцем вясёлым прысеў*
*І ўмывае свой твар.*
*Нікне ўсё пакрысе,*
*І ўсё ахутвае твань.*

*Яны ж моўчкі крышталяць кругі, –*
*Іх у гэтым уцеха уся.*
*Кожны з нас заўтра другі…*
*Будзем блукацца там-сям.*

*Бо ніяк, аніяк*
*Немагчыма жыццю дагадзіць.*
*Не адзін перад ім ужо змяк, –*
*Хоць і хацеў*
*Схапіць выбрык гадзін.*
[1925 г.]